*Аляксандр Карацееў*

# РЭПЕТЫЦЫЯ ДЛЯ БУДУЧЫНІ

**Некаторыя аспекты развіцця самадзейнай духавой музыкі**



Першыя крокі, першыя такты...

*Усесаюзны агляд самадзейнай мастацкай творчасці, прысвечаны 40-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, працягваецца да мая 1985 года. Яго праводзяць Міністэрства культуры СССР, ВЦСПС, ЦК ВЛКСМ, Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР, Міністэрства асветы СССР, Дзяржаўны камітэт СССР па прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі, Дзяржаўны камітэт СССР па тэлебачанню і радыёвяшчанню.*

*Адметнасць агляду ў тым, што праходзіць ён непасрэдна ў дамах і палацах культуры, на прадпрыемствах, клубных сцэнах калгасаў і саўгасаў, на будоўлях, у вышэйшых навучальных установах.*

*Тысячы народных тэатральных, харавых, танцавальных калектываў, студый выяўленчага мастацтва пакажуць спектаклі і канцэртныя праграмы, творы жывапісу, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, праеякнутыя пачуццём любві да сацыялістычнай Радзімы, Камуністычнай партыі, якія ўслаўляюць баявы і працоўны подзвіг савецкага народа, яго адданасць ідэалам камунізму.*

*Часопіс будзе інфармаваць чытачоў пра найбольш значныя падзеі агляду, друкаваць матэрыялы пра асобныя калектывы, пра шэфства прафесійных майстроў над мастакамі-аматарамі.*

З кожным годам усё больш актывізуецца ўдзел савецкіх людзей у самадзейнай мастацкай творчасці. Гэта тлумачыцца перш за ўсё ростам дабрабыту працоўных нашай краіны, павелічэннем вольнага часу. Як адзначаюць спецыялісты ў галіне культурна-асветніцкай работы І. Ляшэнка і Ю. Пятроў, «творчы працэс у сферы адпачынку нясе ў сабе вельмі важную ідэалагічную і палітычную нагрузку. Ён садзейнічае дыялектычнаму ўзаемадзеянню сацыяльных абставін і актыўнасці характару чалавека, асэнсаванню рэвалюцыйных традыцый і маральных норм сацыялізму»[1].

Ва ўмовах развітога сацыялістычнага грамадства адной з цэнтральных задач з'яўляецца павышэнне культурнага ўзроўню асобы. Важнае месца ў камуністычным выхаванні займае музычная творчасць. Разам з вялікай роляю, якую выконвае прафесійнае мастацтва, важкі ўклад у духоўнае і культурнае ўзбагачэнне савецкіх людзей уносіць і мастацтва самадзейнае.

Кожны вечар гасцінна расчыняюцца дзверы клубаў, дамоў і палацаў культуры прадпрыемстваў і ўстаноў рэспублікі. Удзел у мастацкай самадзейнасці не толькі дапамагае духоўнаму развіццю чалавека, але і з'яўляецца крыніцай станоўчых эмоцый. Шматлікасць жанраў мастацкай самадзейнасці дае кожнаму савецкаму чалавеку неабмежаваныя магчымасці для развіцця індывідуальных здольнасцей і духоўнай самарэалізацыі, абуджае творчы пачатак асобы.

Яркай дэманстрацыяй развіцця самадзейнай мастацкай творчасці з'явіўся праведзены ў 1975—1977 гг. першы Усесаюзны фестываль самадзейнай мастацкай творчасці працоўных, на якім былі прадстаўлены лепшыя творчыя калектывы клубаў сістэмы Міні-



РЕПОЗИТОРИЙ





На рэпетыцыі. Народны духавы аркестр Палаца культуры МТЗ.

Народны духавы аркестр Палаца культуры БелАЗа (г. Жодзіна).

стэрства культуры, прафсаюзных устаноў культуры, мастацкая самадзейнасць воінаў, студэнтаў, навучэнцаў прафесійна-тэхнічных устаноў. Гэты фестываль у значнай меры садзейнічаў далейшаму развіццю масавай мастацкай творчасці працоўных, павышэнню ідэйна-мастацкага ўзроўню самадзейнага мастацтва і спрыяў нараджэнню новых калектываў. Толькі за 1975—1976 гг. у клубных установах Міністэрства культуры БССР было створана 1020 гурткоў мастацкай самадзейнасці. А ўсяго на сённяшні дзень у рэспубліцы працуе больш як 21 000 калектываў. Усе яны ўдзельнічаюць і ва Усесаюзным аглядзе самадзейнай мастацкай творчасці, прысвечаным 40-годдзю Перамогі.

Сярод гэтых калектываў сваё майстэрства паказваюць і самадзейныя духавыя аркестры. Да нядаўняга часу ў Беларусі, як і па ўсёй краіне, назіраўся некаторы спад гэтага масавага і папулярнага жанру. Такую з'яву можна растлумачыць недастатковым забеспячэннем духавых аркестраў неабходнымі інструментамі, недахопам кваліфікаваных кіраўнікоў, малой колькасцю нотнай літаратуры для аркестраў розных саставаў і іншымі прычынамі. Але з часам гэтыя цяжкасці вырашаюцца. У адпаведнасці з пастановай Прэзідыума ВЦСПС, бюро ЦК ВЛКСМ, Калегіі Міністэрства культуры СССР, Калегіі Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР і Калегіі Дзяржкамітэта СССР па прафесійна-тэхнічнай адукацыі ад 3 студзеня 1975 года «Аб правядзенні першага Усесаюзнага фестывалю самадзейнай мастацкай творчасці працоўных» развіццю духавых аркестраў краіны была аказана вялікая ўвага і дапамога. У Беларусі, напрыклад, у час правядзення фестывалю было створана 10 духавых аркестраў.

Прынцыпова аднесліся да праблемы развіцця духавых аркестраў у Бабруйску. Трэба адзначыць, што ў горадзе не было ніводнага духавога аркестра, які б адказваў сучасным патрабаванням. Асабліва адчувалася адсутнасць цікавасці да гэтага жанру сярод моладзі. Было вырашана ў час летніх школьных канікулаў арганізаваць у піянерскіх лагерах невялікія па складу калектывы. Гэта вельмі зацікавіла дзяцей, жадаючых наведваць заняткі ў аркестры было шмат. Атрымаўшы навыкі ігры на духавых інструментах, добрую практыку ў піянерскіх аркестрах, школьнікі пазней увайшлі ў склад вялікіх аркестраў прадпрыемстваў горада. Так у выніку канкрэтных мер многія калектывы папоўніліся здольнай моладдзю. Яркім прыкладам можа служыць духавы аркестр Дома культуры Бабруйскага дрэваапрацоўчага камбіната вытворчага аб'яднання «Бабруйскдрэў», які паспяхова выступіў вялікім саставам на Усесаюзным фестывалі.

У час правядзення фестывалю самадзейнай творчасці летам 1976 года ў Мінску адбылося першае рэспубліканскае свята духавой музыкі, агляд-конкурс аркестраў духавых інструментаў школ і дзіцячых дашкольных устаноў. Адзначым шырокую яго прадстаўнічасць: ад Брэсцкай вобласці выступіла тады сем аркестраў, ад Віцебскай — 4, Гомельскай і Гродзенскай — па 6, ад Магілёўскай вобласці — 5 і ад Мінскай — 8.

Кульмінацыяй дзіцячага свята духавой музыкі было канцэртнае выступленне зводнага духавога аркестра, складзенага з 1 100 юных музыкантаў. Пад кіраўніцтвам галоўнага дырыжора агляду-конкурсу народнага артыста БССР дацэнта Белдзяржкансерваторыі Б. Пенчука гэты шматгалосы калектыў выканаў песні: «Ленін заўсёды з табой» С. Тулікава, «Піянерскі марш» М. Фрадкіна, «Песню пра трывожную маладосць» А. Пахмутавай, хор «Слаўся» з оперы М. Глінкі «Іван Сусанін»...

Фарміраванне дзіцячых духавых аркестраў у нас не праходзіць лёгка. І тут, на мой погляд, трэба падрабязна вывучыць вопыт работы з юнымі музыкантамі ў Літоўскай ССР. Разам з тым з'яўленне ў Беларусі новых дзіцячых духавых аркестраў сведчыць, што музычнаму мастацтву, выхаванню мастацкага густу ў нашых школах пачынаюць удзяляць больш увагі.

Важным стымулам папулярызацыі музычнага мастацтва, удасканалення выканаўчага майстэрства з'яўляецца правядзенне святаў духавой музыкі і маршаў-парадаў духавых аркестраў, аглядаў-конкурсаў, справаздачных канцэртаў і г. д. Можна толькі ганарыцца, што ў нашай рэспубліцы налічваецца каля трыццаці самадзейных духавых аркестраў, якія за актыўную канцэртную дзейнасць, папулярызацыю духавой музыкі ўдастоены высокіх званняў «Народны самадзейны калектыў» і «Узорны самадзейны калектыў».

Высокае выканаўчае майстэрства, стабільнасць работы, значныя зрухі ў пашырэнні рэпертуару прадэманстравалі калектывы ў час канцэртных выступленняў 1983 года на пацвярджэнне ганаровых званняў. У Гомелі з цікавай і складанай праграмай выступіў адзін са старэйшых музычных калектываў Беларусі, які існуе з 20-ых гадоў,— народны духавы аркестр Палаца культуры вытворчага аб'яднання «Гомельдрэў» імя 60-годдзя Вялікага Кастрычніка (кіраўнік Ю. Згерскі). Тое ж можна сказаць і пра народны духавы аркестр Палаца культуры вытворчага аб'яднання «Бабруйскдрэў» (кіраўнік М. Шлык), які існуе трыццаць пяць гадоў і лічыцца адным з вядучых калектываў рэспублікі. На базе гэтага аркестра адбыўся семінар кіраўнікоў аркестраў Магілёўскай вобласці, які праводзіў галоўны дырыжор зводнага духавога аркестра прафсаюзаў горада Мінска З. Танклеўскі.

Цікавы быў VII традыцыйны агляд-конкурс народных духавых аркестраў Мінскай вобласці, прысвечаны 40-год-



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

дзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У склад журы ўвайшлі народны артыст БССР намеснік старшыні Саюза кампазітараў БССР Я. Глебаў, заслужаны артыст БССР начальнік ваенна-аркестравай службы ЧБВА Б. Чудакоў, заслужаны дзеяч культуры БССР загадчык кафедры эстрадна-духавога дырыжыравання Мінскага інстытута культуры М. Салдатаў, галоўны дырыжор зводнага духавога аркестра прафсаюзаў горада Мінска З. Танклеўскі і іншыя.

Упэўнена выступіў з абавязковай і канцэртнай праграмамі духавы аркестр Слуцкага ГДК (кіраўнік І. Музычка), які быў адзначаны дыпломам III ступені. Як заўсёды, парадаваў сваім выступленнем духавы аркестр Мінскага радыётэхнічнага інстытута, які з'яўляецца адным з вядучых калектываў свайго жанру ў рэспубліцы (кіраўнік М. Падлуцкі). У цікавай інтэрпрэтацыі былі выкананы калектывам «Час, наперад!» і вальс з музычнай ілюстрацыі да аповесці А. Пушкіна «Завіруха» Г. Свірыдава. Калектыў аркестра прадставіў на конкурс і свой ансамбль — трыо кларнетыстаў. Багатае, насычанае гучанне аркестр прадэманстраваў у абавязковым творы — урачыстай прэлюдыі «Слава народам нашай краіны» І. Шышова, высокі выканаўчы ўзровень паказаў у «Рапсодыі на тэмы камсамольскіх песень» Б. Цярэнцьева. З запалам студэнты выканалі і «Юбілейны марш» Я. Глебава. У сваю праграму аркестр уключыў творы для салістаў-інструменталістаў: «Вальс для саксафона-альта» М. Пятрэнкі (саліст І. Чарняк), «Неапалітанскую песеньку» з балета П. Чайкоўскага «Лебядзінае возера» (саліст А. Ліўшыц). Прыемна, што калектыў МРТІ трымае сувязь з прафесійнымі выканаўцамі. На гэты раз з аркестрам выступала салістка Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета БССР Вольга Цішына, якая выканала песню «Расцвітай, Беларусь» Ю. Семянякі на верш А. Бачылы. Але, нягледзячы на ўсе творчыя поспехі, па строгіх ацэнках журы духавы аркестр МРТІ быў адзначаны дыпломам II ступені, таму што не выканаў умовы конкурсу па рабоце з сельскім калектывам-спадарожнікам.

Аркестр Палаца культуры Беларускага аўтамабільнага завода (г. Жодзіна) вядомы як стабільны творчы калектыў. Але на гэты раз ён выступіў значна ніжэй сваіх магчымасцей, хоць варта адзначыць добрае выкананне «Галопа» з оперы «Калючая ружа» Ю. Семяняка, «Юбілейнага марша» Я. Глебава, марша «У партызанскім краі» І. Любана. Выступленне аркестра з Жодзіна паказала, што нельга захапляцца вельмі складанымі творамі (як, напрыклад, «Рапсодыя на тэмы мелодый народаў СССР» Б. Дзіева), калі калектыў не можа выканаць іх на добрым узроўні.

Цёпла прымалі слухачы выступленне духавога аркестра Мінскага вытворчага аб'яднання імя Леніна (кіраўнік Б. Сармонт), які аддаў перавагу эстраднай стылістыцы. Удала быў выкарыстаны аркестрам барытон як сольны інструмент у п'есе А. Прайса «Дом узыходзячага сонца» (саліст А. Гофман). Цікавымі і арыгінальнымі былі супастаўленні і тэмбральныя камбінацыі ў гучанні бас-гітары, саксафонаў (тэнар і барытон), трамбона, тубы, калі дасягаўся каларытны фуз-эфект, характэрны для электрамузычных інструментаў. Цікава слухалася першае выкананне «Святочнага марша» Б. Сармонта, які вылучаўся насычанай, багатай інструментоўкай, яркімі, кантраснымі кантрапунктамі барытона, тэнара, групы саксафонаў. Выкарыстанне саксафоннай групы значна ўзбагаціла гучанне аркестра. Наяўнасць такой групы патрабуе вялікай самаадданасці ў рабоце і высокай кваліфікацыі кіраўніка. Пры добрай арганізатарскай рабоце і практычнай дапамозе з боку вопытных кансультантаў, музыкантаў вядучых прафесійных калектываў, выкладчыкаў навучальных устаноў рэспублікі можна было б дасягнуць значных зрухаў у пашырэнні сродкаў выразнасці духавых аркестраў з саксафоннай групай, вырашыць праблему развіцця ў рэспубліцы эстрадных і джазавых інструментальных ансамбляў і аркестраў. А пакуль што выступленне квінтэта саксафаністаў гэтага калектыву (сапрана, два альты, тэнар, барытон) было не зусім паспяховым. У выкананай імі Прэлюдыі мі-бемоль мажор І. С. Баха не адчуваўся характар твора, таму што музыканты-аматары ігралі ў свабоднай эстрадна-джазавай манеры. Але ў цэлым аркестр прыкметна адрозніваўся ад іншых калектываў дзякуючы накіраванасці праграмы, укамплектаванасці саставу, наяўнасці жаночай вакальнай групы, валоданню эстраднай манерай выканання.



Народны духавы аркестр Палаца культуры аб'яднання «Гомельдрэў».

Добра сустрэлі слухачы ўдзельнікаў дзіцячага узорнага духавога аркестра Палаца культуры тэкстыльшчыкаў горада Мінска (кіраўнік У. Яшчэмбскі). Да пачатку выступлення школьнікі бестурботна бегалі па фае, з захапленнем і зайздрасцю глядзелі на дарослых музыкантаў. На сцэне яны зрабіліся сур'ёзнымі і ўважнымі артыстамі. У выкананні дзіцячага аркестра прагучалі «Песня аб Радзіме» і «Ляціце, галубы» І. Дунаеўскага, «Песня пра Леніна» А. Новікава, «І зноў працягваецца бой» А. Пахмутавай і многія іншыя.

Характэрнай асаблівасцю агляду-конкурсу было тое, што журы ацэньвала калектывы не толькі па канкрэтнаму конкурснаму выступленню, але і па цэламу шэрагу іншых аспектаў, якія характарызуюць дзейнасць самадзейных калектываў. Гэта аб'ектыўна паказвала работу кіраўніка і ўсяго калектыву за пэўны перыяд. Акрамя ацэнкі выканальніцкага майстэрства, складанасці рэпертуару, рэжысуры конкурснай праграмы, сцэнічнасці і культуры паводзін, укамплектаванасці складу аркестра, журы пры падліку балаў для вызначэння пераможцаў улічвала таксама і абавязковую работу з сельскім калектывам, стабільнасць работы, актыўнасць удзелу ў грамадскім жыцці.

Упрыгожыла конкурс выступленне духавога аркестра Мінскага вытворчага аб'яднання «Гарызонт», які стаў лаўрэатам і быў адзначаны дыпломам I ступені. Майстэрства гэтага аркестра расце дзякуючы мэтанакіраванай рабоце яго кіраўнікоў: былога — А. Голада і сённяшняга — У. Навуменкі. Пры выкананні першага абавязковага конкурснага твора — урачыстай прэлюдыі «Слава народам нашай краіны» І. Шышова кіраўнік упэўнена і лагічна кіраваў дынамікай гучання, зменай тэмпаў, «упляценнем» аркестравых галасоў, тэмбральнымі налажэннямі гучання аркестравых груп. Артыстычнасцю вылучылася выступленне В. Раманоўскага ў песні «Нашага юнацтва аркестр» П. Аеданіцкага. Цудоўнае гучанне і зладжанасць былі прадэманстраваны пры выкананні «Вальса», «Марша» з музычнай ілюстрацыі да аповесці А. Пушкіна «Завіруха». Бездакорна гучаў аркестр у «Венгерскім танцы» з балета «Раймонда» А. Глазунова, фантазіі на тэмы песень У. Алоўнікава, «Партызанах Беларусі» А. Амірава, у творах «Лявоніха» і «Звон адыходзячага лета» Я. Глебава. Парадаваў сваім выступленнем Г. Баранскі, які выканаў п'есу «Фестываль» А. Пейджа для трубы з аркестрам.

Выступленне аркестра МВА «Гарызонт» паказала: там, дзе вядзецца сапраўдная творчая работа, ніколі не ўзнікаюць праблемы развіцця жанру,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУИР



Лекцыю-паказ для ўдзельнікаў духавых аркестраў праводзіць загадчык кафедры эстрадна-духавога дырыжыравання Мінскага інстытута культуры М. Салдатаў.

Таму на семінарах кіраўнікоў духавых аркестраў трэба больш актыўна прапагандаваць лепшыя формы і метады работы нашых вядучых калектываў. У час агляду-конкурсу міжсаюзным Домам мастацкай самадзейнасці Белсаўпрофа праводзіўся рэспубліканскі семінар кіраўнікоў сельскіх самадзейных духавых аркестраў, заняткі па тэмах «Актуальныя пытанні выхаваўчай работы ва ўмовах узмацнення ідэалагічнай барацьбы двух сацыяльных сістэм», «Сацыяльна-педагагічныя праблемы ўдасканалення навучальнай і выхаваўчай работы з удзельнікамі самадзейнага калектыву», «Фарміраванне рэпертуару духавога аркестра». Заняткі па тэмах «Інструментазнаўства і асноўныя прынцыпы пералажэння для самадзейнага духавога аркестра», «Аркестравая партытура, яе музычны аналіз», «Аркестрава-ансамблевая падрыхтоўка», «Тэхніка дырыжыравання» ў значнай ступені з'арыентавалі кіраўнікоў у складаных пытаннях работы з духавым аркестрам. Набытыя веды замацоўваліся на практычных занятках, якія праводзіліся ў форме лекцый-паказаў у Мінскім інстытуце культуры. Іх праводзіў загадчык кафедры эстрадна-духавога дырыжыравання М. Салдатаў.

Усё новыя і новыя аркестры, якія ў выніку шматгадовай карпатлівай працы дасягнулі высокіх вынікаў, прадстаўляюцца да прысвоення ганаровага звання «Народны самадзейны калектыў». Нядаўна гэтае званне атрымаў духавы аркестр рэспубліканскага Палаца культуры прафтэхадукацыі (ст. дырыжор У. Ключнік, педагог-рэпетытар А. Гусін), створаны ў 1971 годзе. Калектыў паспяхова займаецца канцэртнай дзейнасцю і абслугоўваннем грамадска-палітычных мерапрыемстваў. Музыканты прымалі ўдзел у III фестывалі дружбы савецкай і балгарскай моладзі, спартыўна-тэатралізаваных прадстаўленнях у мінскім Палацы спорту... Дзейнасць аркестра адзначана Ганаровымі граматамі ЦК ЛКСМБ, аргкамітэта па правядзенню першага Усесаюзнага фестывалю мастацкай творчасці працоўных, ЦК ДТСААФ БССР. Сваё майстэрства аркестр прадэманстраваў у «Маршы працоўных рэзерваў» І. Лучанка, іншых творах кампазітара, у песнях-маршах «Мая Масква» І. Дунаеўскага, «Успамін пра палкавы аркестр» Ю. Гуляева.

Прысуджэнне ганаровага звання будзе стымуляваць дзейнасць духавых аркестраў сістэмы прафтэхадукацыі. Тут мае значэнне не столькі сам факт прысваення звання народнага калектыву, колькі вырашэнне праблемы пераемнасці.

З кожным днём усё больш востра адчуваецца неабходнасць далейшага развіцця самадзейных духавых аркестраў рэспублікі, пастаяннага ўдасканалення іх выканаўчага майстэрства і павышэння ролі ў прапагандзе музычнага мастацтва. Можна спадзявацца, што ў Беларусі святы духавой музыкі і маршы-парады, канцэртныя выступленні самадзейных духавых аркестраў будуць адбывацца на самым высокім узроўні. Для гэтага неабходна дакладна вызначыць перспектывы развіцця жанру ў рэспубліцы і мэтанакіравана ажыццяўляць іх у дзейнасці нашых калектываў. Тут павінны сказаць сваё слова кафедры Белдзяржкансерваторыі, Мінскага інстытута культуры, музычных вучылішчаў і дзіцячых музычных школ рэспублікі, а таксама міжсаюзны Дом самадзейнай творчасці Белсаўпрофа і рэспубліканскі навукова-метадычны цэнтр культурна-асветнай работы і народнай творчасці.

---

[1] І. Ф. Ляшэнка, Ю. В. Пятроў. Навукова-тэхнічная рэвалюцыя і духоўная культура.—У зб. «Асаблівасці культурна-асветнай работы ва ўмовах НТР». Тэзісы дакладаў на навукова-практычнай канферэнцыі.—Нікалаеў. 1980, с. 18.

## МІНСК

У апошнія дні снежня 1983 года ў мінскім Палацы культуры і спорту чыгуначнікаў імя У. І. Леніна адбылася творчая справаздача студэнтаў чацвёртага курса кафедры харэаграфіі Мінскага інстытута культуры, прысвечаная 40-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.

Першае аддзяленне канцэрта-справаздачы складалася з танцаў народаў СССР. Сярод іх былі рускі танец, эстонская жартоўная полька, «Узбекскі эцюд», малдаўскі танец «Харо», літоўскі «Кубілас», асецінскі «Сімд» і іншыя.

У другім аддзяленні творчай справаздачы гледачы ўбачылі нацыянальныя танцы народаў свету — польскі народны танец «Кракавяк», румынскі «Брыул», венгерскі «Чардаш», іспанскія мініяцюры і іншыя.

## ГОМЕЛЬ

«Гарызонты Гомельшчыны» — так называлася абласная выстаўка мастацкай фатаграфіі, прысвечаная 40-годдзю вызвалення Гомельшчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, якую падрыхтавалі фотааматары Гомеля і Рэчыцы, Светлагорска і Веткі, Мазыра і гарадскога пасёлка Акцябрскі. Усяго на ёй экспанавалася 206 фотарэпартажаў, пейзажаў, партрэтаў 88 аўтараў. Сярод удзельнікаў выстаўкі былі 43 юныя фатографы. Яны прадставілі 64 работы.

## ВІЦЕБСК

Мерапрыемствы Усесаюзнага агляду самадзейнай мастацкай творчасці, прысвечанага 40-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, адбываюцца ў гарадах і раёнах Віцебшчыны.

Сапраўдным святам самадзейнай мастацкай творчасці стаў конкурс удзельнікаў мастацкай самадзейнасці Віцебскага завода тэлевізараў, у якім удзельнічалі больш як 20 цэхаў і падраздзяленняў — усяго каля 600 чалавек.

Гледачы ўбачылі кампазіцыі «Мір — планеце», «Каб не было вайны», «Ніколі не забудзем», кампазіцыю, прысвечаную легендарнаму партызанскаму герою М. П. Шмырову, і іншыя.

На дзіва цікавая атрымалася кампазіцыя «Малюнкі беларускай восені», створаная на аснове беларускага фальклору.

З поспехам прайшоў агляд на іншых прадпрыемствах — на віцебскіх заводах электравымяральных прыбораў, заточных станкоў, на швейнай фабрыцы «Сцяг індустрыялізацыі» і іншых.

## ОРША

У аглядзе цэхавай самадзейнай творчасці на Аршанскім ордэна Леніна льнокамбінаце ўдзельнічалі 8 калектываў — 960 чалавек. Гледачоў усхвалявалі такія кампазіцыі, як «Гарачы снег», «Хотят ли русские войны». Са сцэны Палаца культуры гучалі вершы паэтаў ваенных гадоў і нашых сучаснікаў.



РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ